5. Мажэйка, З. Я. Лірычныя песні / З. Я. Мажэйка // Беларускі фальклор : Энцыклапедыя : У 2 т. Т. 2. – Мінск : БелЭн, 2006. – С. 32–33.
6. Мажэйка, З. Напевы зімовых песень / З. Мажэйка // Зімовыя песні. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – С. 28–50.
7. Фрейденберг, О. М. Поэтика сюжета и жанра / О. М. Фрейденберг. –М. : Лабиринт, 1997. – 448 с.

***Вера Мішына***

## УЯЎЛЕННІ ПРА ЗНАХАРСТВА І ЧАРАЎНІЦТВА Ў КАНТЭКСЦЕ ТРАДЫЦЫЙНАГА ВЯСЕЛЛЯ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

***Vera Mishina***

## PERCEPTIONS OF SORCERY AND MAGIC IN THE CONTEXT OF A TRADITIONAL WEDDING BELARUSIANS FROM PADZVINNE

*У дадзеным артыкуле аўтар разглядае ўзаемасувязі феноменаў чараўніцтва і знахарства з формай і зместам традыцыйнага вясельнага абраду беларусаў гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвінне.*

*The article explores the interrelationship of the phenomena of sorcery and witchcraft in the traditional wedding rite of the Belarusians of the Padzvinne region.*

Дадзенае даследаванне феноменаў чараўніцтва і знахарства з традыцыйным вясельным абрадам беларусаў Падзвіння было выканана ў рамках праекта БРФФД-РГНФ (ПР) «Традиционный этнокультурный и языковой ландшафт Витебско-Псковского пограничья в конце XIX – начале XXI в.: уровни репрезентации и динамика кросскультурных связей» у адпаведнасці з дамовай № Г16РП-004.

Паводле даследаванняў апошніх гадоў, чараўніцтва і знахарства ў традыцыйнай карціне свету беларусаў (у тым ліку і на тэрыторыі Падзвіння) паўстаюць як неадназначныя і шматпланавыя феномены . Дыяпазон функцыянальна-статусных характарыстык чараўніка (ведзьмара) і знахара надзвычай шырокі: ад поўнага проціпастаўлення («вядзьмар і знахар дзейнічаюць з дапамогаю нячыстай сілы, але народ строга адрознівае іх: вядзьмар робіць зло не толькі наўмысна, але … і міжволі…, а знахар нікому не робіць шкоды, але адлечвае тое зло, якое наклікаў вядзьмар») [2, с. 85] да перакананасці, што яны настроены да чалавека пераважна варожа: «яшчэ мацней выяўляецца гэтая сіла чараўнікоў, знахароў і калдуноў на самых сялянах, з якімі яны могуць усё зрабіць» [2, с. 84].

Гэтая ж неадназначнасць феноменаў знахарства і чарадзейства знайшла адлюстраванне ў традыцыйным вясельным абрадзе. Рытуальна-міфалагічны кантэкст вяселля як абраду пераходу, з аднаго боку, стварае аптымальныя ўмовы для ажыццяўлення шкоданосных уздзеянняў, з другога – патрабуе выкарыстання спецыяльных сродкаў для іх прадухілення. Адсюль – уяўленні аб тым, што маладых на вяселлі можна сурочыць ці зачараваць, а таксама выкарыстанне шматлікіх апатрапейных прыёмаў з мэтай пазбегнуць гэтага.

Так, менавіта з апатрапейнымі мэтамі знахара запрашалі на вяселле ў якасці дружкі: «Дружкам выбіраюць чалавека, які ўмее «аддзелываць» у выпадку неабходнасці, так як на вяселлі часта чаруюць. Бываюць выпадкі, што на дарозе, дзе павінны праехаць маладыя, запальваюць некалькі кулёў саломы, коні не пойдуць праз агонь, а таму дружка, знахар зможа «аддзелаць» гэта» [6, с. 398]. Істотным крытэрыем для выбару дружкі з'яўляецца менавіта здольнасць «аддзелываць», г.зн. нейтралізоўваць мэтанакіраванае чараўніцтва супраць маладых. Такім чынам, у дадзеным выпадку чараўніцтва фігуруе як мэтанакіраванае шкоданоснае ўздзеянне на маладых, а знахарства («аддзелыванне») выступае ў якасці засцерагальнага дзеяння.

Дружка-знахар выконвае свае абарончыя функцыі ў важнейшыя моманты вясельнага абраду: перад тым, як увесці нявесту ў хату перад благаславеннем, ён «абыходзіць тры разы вакол баярак і нявесты з нашэптваннямі» [6, с. 408], таксама тройчы «з нашэптваннямі» абыходзіць вясельны поезд перад ад'ездам у дом жаніха [6, с. 412]; «абыходзіць вакол маладых з нашэптваннем тры разы і кладзе на пасцель, сцебануўшы іх злёгку пугай» [6, с. 413]. У той жа час прысутнасць знахара на вяселлі магла і не афішавацца: «невядомы нікому, мала прыкметны на сваёй службе, ён ідзе за жаніхом у царкву, у дарогу і вядзе сваю абярэжную службу да поўнага завяршэння шлюбнай урачыстасці. Асоба знахара наўмысна бывае схавана ад чужых; часта і сам жаніх даведваецца пра свайго нябачнага апекуна толькі пасля сканчэння ўсяго таго, што так лёгка можа наклікаць нейкае няшчасце на маладых мужа і жонку» [7, с. 41].

Што тычыцца чараўніка, то яго запрашэнне на вяселле выглядае хутчэй вымушаным: «У час сямейных урачыстасцей, вяселляў, хрэсьбін чараўніка саджаюць на ганаровае месца, звяртаюць на яго выключную ўвагу, асабліва старанна частуюць, каб не раздражніць яго і тым не пашкодзіць будучаму шчасцю маладых ці нованароджанага» [8, с. 250]. Уяўленні аб патэнцыйнай шкоданоснасці чараўнікоў устойліва захоўваюцца на тэрыторыі Падзвіння і ў сучаснасці: «Свадзьба была. А ў нас быў чараўнік. І не пазаві – здзелаіць. І пазаві – можаць здзелаць» [5, с. 32]. Разам з тым, дзеянні чараўніка маглі быць скіраваныя на выяўленне і «нейтралізацыю» чараў, ажыццёўленых іншым чараўніком (чараўніцай): «Стараліся падлажыць у той узёл, дзе будуць спаць. А ён усё нашоў. Узяў, прыносіць с утра сюды, дзе хазяйка будзіць печ тапіць і гаворыць: «Як толькі первы дым пакажацца, закіньця туды за дровы». Як закінулі – прыбігаіць баба нагала, качаргу ўхапіла, абжаргала (асядлала) і скрозь дзярэўні ўзад-упярод. А так бы маладыя гэдак раздзеліся і бегалі" [5, с. 32]. Аднак тут, відаць, мэтазгодна гаварыць не столькі аб імкненні прадухіліць нанясенне шкоды маладым, колькі аб свайго роду «канкурэнцыі» двух носьбітаў шкоданоснага ўздзеяння. Падобнага роду наратывы можна суаднесці з вядомым сюжэтам аб спаборніцтве двух чараўнікоў на вяселлі, звязаным з уяўленнямі аб рознай ступені праяўлення іх здольнасцей (большай ці меншай «сіле»). Па вызначэнні У. А. Лобача, абавязковая прысутнасць чараўніка на вяселлі выконвала функцыю сацыяльнага кантролю над вёскай і ўвасабляла з аднаго боку праяву «хоць і баязлівай, але павагі, да чараўніка», з другога – служыла «своеасаблівым абярэгам для маладых» [3, с. 215].

Паводле ўстойлівых і шырока распаўсюджаных уяўленняў, найбольшай шкодай, якую можа здзейсніць чараўнік на вяселлі, з'яўляецца пярэваратніцтва. Паводле запісаў другой паловы XIX стст, «гэта вераванне настолькі распаўсюджана ў Віцебскай губерні, і пераважна ў Віцебскім уездзе, што яго можна чуць у кожнай вёсцы ад старога гэдак жа, як і ад малога» [8, с. 253]. Сюжэты пра зламыснае пераварочванне вясельнага поезда ў ваўкоў фіксуюцца і падчас сучасных палявых даследаванняў на Падзвінні .



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Варта адзначыць, што статусная няпэўнасць маладых робіць іх уразлівымі не толькі да, так бы мовіць, «прафесійнага» шкоданоснага ўздзеяння чараўніка. Паводле традыцыйных уяўленняў, сурочыць або зачараваць маладых можа хто заўгодна. Асаблівую цікавасць у гэтым плане выклікаюць тэксты, дзе галоўным суб'ектам чараўніцтва становіцца пакінутая хлопцам дзяўчына, асабліва тая, што нарадзіла ад яго дзіця. Відавочна, што парушэнне парадку жыццёвага сцэнару дзяўчыны (змена стану не санкцыянавана супольнасцю праз рытуальныя механізмы, нараджэнне дзіцяці адбылося раней за вяселле) абумоўлівае яе спецыфічны статус, які выходзіць за межы сацыякультурных нормаў. Адпаведна, як і ў выпадку іншых адхіленняў ад нормы (калецтва, жабрацтва і да т.п.), носьбіт такога статусу надзяляецца ў народнай свядомасці ўзмоцненымі магічнымі здольнасцямі: «…буваець так, што хлопец дружыў, дружыў з адный дзеўкай, а тую не ўзяў, узяў кінуў тую. А яна ад яго радзіла, а ён другую ўзяў. Гэта точна было. І вот гэта дзеўка праклінаець гэтага хлопца, як яна заклянець, так яму і астанецца. Праклянець: «Каб ты век жаніўся, сколькі будзеш жыць», значыт і будзець жаніцца. Праклянець: «Каб у цябе дзеці не гадаваліся», так і будзець. І гэта сушчая праўда» [4, с. 224]. Акцыянальны аспект падобнага чараўніцтва-помсты прадстаўлены ў асноўным дзеяннямі, накіраванымі на сімвалічнае "перакрэсліванне" дарогі маладым, што мае сваім вынікам разнастайныя нягоды ў іх будучым жыцці: «вот, напрымер, ен любіцца с адной, ну а жэніцца с другой. ... А ен тады як ужо вязець маладуху, яна тады ката за хвост цігаіць па дарозе, каб гаворыць, драліся ўсю жысць» [1]; або выкарыстаннем атрыбутаў з сімволікай смерці: «дзяўчынку зрабіў другой дзеўцы, а замуж не браў… Яна прынясла з магільніку, а яны вянчаюцца. А яна гэтай зямлёй… [Хлопец] ажаніўся, двое дзяцей было, паехаў… на возера і …разам з мальцам утапіліся» [5, с. 28].

Такім чынам, разгляд уяўленняў пра чараўніцтва і знахарства ва ўзаемасувязях з традыцыйным вясельным абрадам беларусаў Падзвіння дазваляе выявіць спецыфічныя аспекты бытавання і дапоўніць характарыстыку гэтых цікавейшых феноменаў народнай культуры.

**Спіс літаратуры:**


1. Запісана Мішынай В. І. і Мішыным П. І. ад Ханяк А.І., 1932 г.н, в. Макараўшчына, Лепельскага р-на, Віцебскай вобл, 2007 г.
2. Зямная дарога ў вырай: Беларускія народныя прыкметы і павер'і : Кн 3. / уклад., прадм., пер. і паказ. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 654 с.
3. Лобач, У. А. Вобраз чараўніка ў традыцыйнай карціне свету беларусаў Падзвіння ХХ – пач. ХХІ ст. (па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый ПДУ) / У. А. Лобач // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. ІІ Міжнар. навук. канф., Полацк, 17-18 красав. 2014 г. : у 2 ч. / Полацкі дзярж. ун-т ; пад аг. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача, С. А. Шыдлоўскага. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – Ч. 1. – С. 213–219.
4. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння : У 2 ч. / Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; склад. У.А. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – Ч. 2. – 332 с.
5. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. ; склад., прадм. і паказ. У. А. Лобача / Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2. – 368 с.
6. Романов, Е. Р. Белорусский сборник. В 9 вып. / Е. Р. Романов. – 1886-1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – Вильна, 1912. – 600 с.
7. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. В 3 т. / П. В. Шейн. – 1887-1902. – Т. 1. Ч. 2 : Бытовая и семейная жизнь белорусса в обрядах и песнях. – СПб., 1890. – 708 с.
8. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. В 3 т. / П. В. Шейн. – 1887-1902. – Т. 3 : Описание жилища, одежды, пищи, занятий; препровождение времени, игры, верования, обычное право; чародейство, колдовство, знахарство, лечение болезней, средства от напастей, поверья, суеверья, приметы и т. д. – СПб., 1902. – 535 с.



***Святлана Анэйка***


## АДЛЮСТРАВАННЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА КАЛЕНДАРА Ў АЙЧЫННЫМ ЖЫВАПІСЕ І ДАКУМЕНТАЛЬНЫМ КІНО


*Аўтар артыкула адсочвае, як старонкі беларускага народнага календара адлюстраваны ў творах жывапісу і ў фільмах неігравога кіно, як кінадакументалісты разам з этнолагамі і этнамузыколагамі ствараюць фільмы аўдыявізуальнай антрапалогіі, фіксуюць і захоўваць праз экран адметнасць народнага календара беларусаў.*



***Sviatlana Aneyka***


## REFLECTION OF THE BELARUSIAN FOLK CALENDAR IN THE NATIONAL PAINTING AND DOCUMENTARY FILMS


*Pages of Belarusian folk calendar reflected in the paintings and films of documentary films. Documentary filmmakers together with ethnologists and ethnomusicologists create movies in the sphere of audiovisual anthropology, fixed and stored with the help of the display the feature of Belarusian folk calendar.*


Багацце і разнастайнасць беларускага фальклору звязана з асноўным гаспадарчым заняткам нашых продкаў з неалітычных часоў – земляробствам. Аграрны тып традыцыйнай айчыннай культуры аказаў значны ўплыў на фарміраванне беларускага народнага календара. Змена сезонаў і адпаведных ім форм сельскагаспадарчай актыўнасці, чаргаванне сонцаваротаў і раўнадзенстваў як маркераў змянення прыродных біярытмаў знайшлі адлюстраванне ў каляндарнай абраднасці, якая ў асноўных сваіх праявах захавалася да нашых дзён.

Як зазначае філолаг А. Ю. Лозка, беларускі народны каляндар – адна з форм духоўнага жыцця нацыі, сістэма свят, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, ігрышчаў, пэўных дзён, забарон, што замацаваны ў побыце і фальклоры беларусаў, і з'яўляюцца арыенцірам пры выкананні сельскагаспадарчых работ і адпачынкаў у гадавым, сезонным, месяцавым цыклах [3,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ